***Андрасюк В. І.**, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Лагішынскай сярэдняй школы Пінскага раёна Брэсцкай вобласці*

# Знаўцы роднай мовы

## Гульня да Міжнароднага дня роднай мовы

***Мэта:*** падагульненне і паглыбленне ведаў вучняў па беларускай мове, літаратуры і культуры.

***Задачы:***

•стварыць умовы для развіцця лагічнага мыслення вучняў, іх творчых здольнасцей;

•садзейнічаць фарміраванню камунікатыўнай кампетэнтнасці навучэнцаў, выяўленню іх інтэлектуальнага патэнцыялу;

•спрыяць выхаванню павагі да культурнай і духоўнай спадчыны беларускага народа, грамадзянскасці і пачуцця патрыятызму.

***Абсталяванне:*** карткі з заданнямі, бланкі для адказаў.

***Умовы гульні.*** Удзельнікі гульні — вучні 4–5 класаў, якія дзеляцца на каманды па 4–6 чалавек. Удзельнікі атрымліваюць карткі з заданнямі і бланкі для адказаў. Запоўненыя бланкі здаюцца пасля кожнага задання і аператыўна правяраюцца. Кожны правільны адказ залічваецца як адзін бал. Агульны бал разлічваецца з сумы балаў усіх заданняў. Каманда, якая набрала найбольшую колькасць балаў, абвяшчаецца чэмпіёнам гульні.

***Эпіграф:*** Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.

*Янка Купала «Спадчына»*

## I. Арганізацыйны этап.

— «Роднае слова — гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы нас свет», — гаварыў Якуб Колас. З роднага слова пачынаецца Радзіма. У кожнага народа ёсць родная мова, якая фарміруе яго свядомасць, самабытнае культурнае аблічча. Моўная культура беларускага народа, увасобленая ў фальклорнай спадчыне, надзвычай багатая, яна — люстэрка самабытных традыцый і звычаяў.

— Сёння мы адправімся ў падарожжа, дзе вас чакаюць цікавыя заданні.

Навучэнцы аб’ядноўваюцца ў каманды, выбіраюць капітана і даюць назву камандзе.

Прадстаўляецца журы.

## II. Конкурсная праграма.

### 1. «Наборшчык».

Неабходна з літар слова *РЭСПУБЛІКА* скласці як мага больш слоў. Пераможца вызначаецца па колькасці слоў альбо па іх даўжыні.

*Адказы:* блік, булка, куб, лік, ліра, публіка, пуск, сук і г. д.

### 2. У якіх словах па сто зычных?

— Упішыце ў правы слупок зычныя гукі, каб атрымаліся словы.

| | |
|---|---|
| сто | [ ] |
| сто | [ ] |
| сто | [ ] |
| сто | [ ] |
| сто | [ ] |

*Адказы:* стог, стол, стоп, стос, столь.

### 3. Чатыры «а».

— Упішыце ў пустыя гарызантальныя клеткі літары, што абазначаюць зычныя гукі, каб атрымаліся словы з чатырма *а.*

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | а | | а | | а | | а |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | а | | а | | а | | а |
| | а | | а | | а | | а |
| | а | | а | | а | | а |
| | а | | а | | а | | а |
| | а | | а | | а | | а |
| | а | | а | | а | | а |

*Адказы:* задавака, кананада, панарама, расамаха, чарапаха, кананада, парабала.

**4. Канструктар.**

— Перастаўце літары так, каб атрымаліся назвы птушак.

СУЛЕБ, АВОНАР, АВЕЙБЕР, ГУЛОБ, ЛЯДЗЕЦ, РАСАКО, АЦІНІС.

*Адказы:* бусел, варона, верабей, голуб, дзяцел, сарока, сініца.

**5. Шыфравальшчык.**

— У табліцы зашыфраваны запавет Кузьмы Чорнага дзецям. Расшыфруйце яго. Дапаможа вам у гэтым добрае веданне алфавіту — трэба расставіць літары левых слупкоў у алфавітнай паслядоўнасці.

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| б | *ну* | | ж | *ужж* | | м | *е* | | т | *ва* |
| я | *ка.* | | ч | *ёс* | | а | *Ша* | | ё | *др* |
| л | *ма* | | с | *і* | | ц | *то* | | ю | *ве* |
| в | *й* | | г | *це,* | | з | *бу,* | | і | *гэ* |
| й | *та* | | д | *дзе* | | е | *ці,* | | к | *са* |
| н | *да* | | у | *ж* | | ш | *ць* | | о | *ра* |
| ў | *на* | | ы | *у* | | п | *го* | | ф | *е,* |
| ь | *ча* | | р | *е* | | х | *ш* | | э | *ла* |

*Адказ:* Шануйце, дзеці, дружбу, гэта самае дарагое і важнае, што ёсць у чалавека.

**6. Хованкі.**

— У гэтым квадраце «схаваліся» пяць назваў агародніны. Знайдзіце іх. Адна літара можа выкарыстоўвацца некалькі разоў.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| А | Н | Е | Ч | А |
| Л | Г | О | Н | С |
| С | А | К | І | П |
| З | Р | О | Х | А |
| У | Б | Д | І | М |

*Адказы:* гарбуз, гарох, памідор, сланечнік, часнок.

**7. Эрудыт.**

— Да скарочаных імён падбярыце поўныя адпаведнікі і запішыце іх.

Алёша —

Валік —

Валя —

Жэня —

Саша —

Света —

Сцёпа —

*Адказы:* Аляксей, Валянцін, Валянціна, Яўген (Яўгеній, Яўгенія), Аляксандр (Аляксандра), Святлана, Сцяпан.

**8. Нечаканыя пераўтварэнні.**

— У дадзеных словах літары пераблытаныя. Паставіўшы кожную літару на сваё месца, атрымаеце назвы жывёл.

Банка, корт, сіла, скала, соль, ток.

*Адказы:* кабан, крот, ліса, ласка, лось, кот.

**9. Незавершаныя сказы.**

— Падбярыце слова, каб закончыць кожны сказ.

1. Раніцай мы снедаем, а ўвечары … .
2. Сёння нядзеля, а заўтра … .
3. У адной мінуце шэсцьдзесят … .
4. Жалеза, медзь, алюміній — гэта … .

*Адказы:* 1 — вячэраем; 2 — панядзелак; 3 — секунд; 4 — металы.

**10. Моўныя прапорцыі.**

— Падбярыце словы, каб захаваць «прапорцыі».

1. Жыццё : шыццё = __________ : сала.
2. Плод : плот = паз : __________ .
3. Гром : хром = __________ : прама
4. Шаль : _______ = хол : гол.

*Адказы:* 1 — зала; 2 — пас; 3 — брама; 4 — жаль.

**III. Падвядзенне вынікаў. Узнагароджванне пераможцаў.**

— Малайцы! Наша гульня скончылася, спадзяюся, што вам спадабалася. Да пабачэння!

А вы, дзеткі нашы, дружна жывіце,
Хутка расціце,
Край свой любіце,
На роднай мове часцей гаварыце!

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 4-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. — Мн. : Нац. ін-т адукацыі, 2020. — 230 с.

2. *Паўлоўская, В. І.* Мова: цікава і займальна / В. І. Паўлоўская. — Мн. : Нар. асвета, 1989. — 221 с. — (Бібліятэка настаўніка беларускай мовы і літаратуры).

3. *Солахаў, А. В.* Займальны матэрыял па беларускай мове : дапам. для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі / А. В. Солахаў. — Мн. : Лексіс, 2007. — 176 с.